УДК 808.26-313.1 (043.3)

**В. Шур[1], Н. Гушча[2]**
[1]Доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай і рускай філалогіі,
УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна”
[2]Аспірант кафедры беларускай і рускай філалогіі,
УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна”

## АРЫГІНАЛЬНА ПРА МАЛЫЯ ЖАНРЫ ФАЛЬКЛОРУ

*Даніловіч М. А. Малыя жанры фальклору Гродзеншчыны / М. А. Даніловіч – Гродна : “ЮрСаПрынт”, 2017. – 254 с.*

Сваю чарговую манаграфію *“Малыя жанры фальклору Гродзеншчыны”* прафесар М. А. Даніловіч прысвяціў апісанню традыцыйных твораў вуснай народнай творчасці, якія ва ўсе часы былі характэрнымі і тыповымі для гэтага рэгіёна, – прыказкам, загадкам, вясельным зычанням, тостам, народным прыкметам, дражнілкам, кленічам, спецыфічным дыялогам, жартам і прыгаворкам, анекдотам, скарагаворкам, забаўлянкам, лічылкам, спецыфічным фразеалагізмам і іншым малым жанрам, якія да апошняга часу не атрымалі належнай фіксацыі ў слоўніках, манаграфіях і падручніках для школ і ВНУ. У гэтым накірунку М. А. Даніловіч – спрактыкаваны і дасведчаны навукоўца, кола яго ўсталяваных навуковых дасягненняў – шматлікія запісы, сістэматызацыя і тэарэтычнае асэнсаванне традыцыйнага для Гродзеншчыны маўлення, рэгіянальных дыялектных адметнасцяў, апісанне фразеалагізмаў, розных іншых твораў фальклору. За апошняе саракагоддзе гэты руплівы даследчык, апрача некалькіх падручнікаў, слоўнікаў, грунтоўных манаграфій па фразеалогіі, апублікаваў больш за сто артыкулаў, а таксама кнігі *“Беларускае вяселле”*, *“Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны”*, *“Дыялектная мова Гродзеншчыны”*, *“Лінгвістычнае краязнаўства Гродзеншчыны”*, пяць выпускаў зборнікаў навуковых прац пад назвай *“Філалагічнае краязнаўства Гродзеншчыны”*, прысвечаных да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка, да 220-годдзя з дня нараджэння Яна Чачота, да 110-годдзя з дня нараджэння Т. Ф. Сцяшковіч і інш.

Пры адборы і апісанні названых вышэй адзінак з фальклору, як пераконвае прачытаны намі матэрыял, прыярытэтнае значэнне надавалася арыгільным, мала вядомым адзінкам і тым, што прэзентуюцца ўпершыню. Заслугоўвае ўхвалы і тое, што ў пачатку разделаў да падборак даецца пэўны тэарэтычны каментарый адносна распрацаванасці і сутнасці пэўнага жанру і яго сучаснай інтэрпрэтацыі. Асабліва пераканальны такі каментарый пра беларускія прыказкі, якія былі аб’ектам увагі многіх збіральнікаў і даследчыкаў. М. А. Даніловіч паказаў, што гэтыя адзінкі ў беларусаў разнастайныя і шматлікія, а мова простых людзей вельмі багатая, засведчаная ў слоўніках беларускіх, рускіх, польскіх збіральнікаў, фалькларыстаў, пісьменнікаў. Нават у наш час з’яўляюцца працы, слоўнікі, якія пераканальна сведчаць, што грунтоўнае тэарэтычнае і практычнае даследаванне беларускіх прыказак па-ранейшаму не страчвае сваёй актуальнасці, а далейшае іх збіранне і слоўнікавая сістэматызацыя застаецца надзённай, бо публікацыйная спадчына ”далёка не ахоплівае ўсяго прыказкавага багацця, якім карыстаецца беларускі народ” (Ф. Янкоўскі). Сведчаннем з’яўляецца, напрыклад, названая праца М. А. Даніловіча, а таксама зборнік А. Зайкі *“Прыказкі і прымаўкі з Косаўшчыны”*, у якім сабрана таксама цікавая калекцыя прыказак і дадзена ім арыгінальная інтэрпрэтацыя.

Уражвае багаццем раздзел *“Вясельныя зычанні”*, якія вельмі скупа і сцісла засведчаны ў ранейшых зборніках фальклору. У кнізе М. А. Даніловіча паводле агульнай тэматычнай накіраванасці вясельныя зычанні падзелены на чатыры групы, адрасаваныя: а) *маладой*; б) *маладому*; в) *маладой і маладому*; г) *іншым удзельнікам вяселля*. Упершыню аўтар зрабіў спробу выкарыстання новай падачы фальклорных адзінак: не паводле алфавітнага месца першага слова, а паводле апорнага кампанента ці слова-ідэнтыфікатара. У гэтым раздзеле, напрыклад, усе адзінкі пачынаюцца словам *дару* (дарую), а ўсяго такіх зычанняў больш за 930 (сс. 121–152), што, безумоўна, уражвае, здзіўляе, пераконвае, што беларусы – мудры народ з багатым і арыгінальным фальклорам, у якім гумару адведзена не апошняе месца.

Такім чынам, лічым адзначыць, што прафесар М. А. Даніловіч працай “Малыя жанры фальклору Гродзеншчыны” грунтоўна дапоўніў існуючую багатую скарбонку беларускага фальклору, а прапанаванымі сучаснымі метадамі яго фіксацыі і навуковай інтэрпрэтацыі спрасціў і палегчыў чытачам і навукоўцам магчымасць іх тлумачэння і ўжывання ў канкрэтных сітуацыях.

МГПУ им. И.П. Шамякина